# Афармленне простай мовы на пісьме

Урок беларускай мовы ў 9 класе

**Т. В. Новикова,**

учитель белорусского языка и литературы

гимназии № 3 г. Могилева

**Мэты:**
выпрацоўваць моўную кампетэнцыю ў вучняў, садзейнічаць іх падрыхтоўцы да экзамену па прадмецце;
развіваць уменне назіраць, абагульняць, сістэматызаваць моўны матэрыял, пашыраць слоўнікавы запас вучняў;
выхоўваць павагу да роднай мовы і традыцыйных каштоўнасцяў.

## Ход урока

1. **Арганізацыйны момант.**
2. **Арфаграфічная размінка (падрыхтоўка да кантрольнага тэста). Правапіс прыслоўяў і блізкіх да іх спалучэнняў. Запіс пад дыктоўку на электроннай дошцы з наступнай праверкай.**
   Дзесьці, куды-небудзь, па-беларуску, паціху, па-свойму, увосень, дадому, спадцішка, спадылба, у адкрытую, нацянькі, напрасткі, увечары, па-брацку, па-суседску, позна, вось-вось, спаднізу, на хаду, больш-менш.
3. **Матывацыйны этап.**
   – Якія спосабы перадачы чужой мовы вы ведаеце?
   Рыхтуючыся да ўрока, вы ўважліва праглядалі зборнік экзаменацыйных матэрыялаў і пераканаліся, што ў многіх тэкстах аўтары прыводзяць простую мову. Наперадзе экзамен, да якога вы рыхтуецеся, а таксама кантрольны тэст, у якім абавязкова будзе заданне па нашай тэме. *Запіс тэмы ўрока.*
4. **Аперацыйна-пазнавальны этап.**
   – Пачынаем са знаёмага матэрыялу, які вы вывучалі яшчэ ў 5 класе.
   Схемы 1-6 на бакавых частках дошкі (гл.ніжэй). Работа з прыкладамі ў парах па варыянтах з наступным размяшчэннем сказаў на дошцы.

1. **„П!“ – а.**

2. **„П?“ – а.**

3. **„П“, – а.**

4. **„П…“ – а.**

5. **А:„П“.**

6. **А:„П?“** **А:„П!“**

**А:„П…“**

(Вучні абменьваюцца прыкладамі 6-ці сказаў з простай мовай, якія яны выпісалі дома са зборніка экзаменацыйных матэрыялаў, кожны сказ адпавядае адной са схем. На асобным аркушы сказы прапаноўваюцца суседу па парце без знакаў прыпынку, якія той павінен расставіць. Затым да кожнай схемы на дошцы вучнямі прымацоўваецца 1 прыклад.)

Запіс сказа пад дыкт. – с.28 зборніка экзаменацыйных матэрыялаў:

*Адам Міцкевіч як бы дэкламуе сённяшнім нашчадкам сваю запаветную малітву: “Дзяцінства край! Ён дораг нам, як першае каханне…”*

Акцэнтуем увагу на шматкроп’і. Суадносім сказ з пэўнай схемай.

– Пераходзім да больш складаных выпадкаў.

**Выпадак 1. Словы аўтара разрываюць простую мову.**

Работа з падручнікам (2019 г.выд.) – с.166. Аналізуем першыя 2 прыклады табліцы.

Запіс пад дыктоўку сказаў са зборніка экзаменацыйных матэрыялаў. Суадносім са схемамі (эл.дошка), назіраем за пунктуацыйным афармленнем.

*С.182 “Таполя” Я ўспомніў тэлеперадачу, дзе паказвалі, як у адной царкве зміраточыла ікона Божай Маці. “Можа, і серабрыстая таполя гэтак жа зміраточыла, – падумаў я. – Магчыма, гэта плакаў сам мастак, у гонар якога было пасаджана незвычайнае дрэва”.*

*С.73 “Назвы, – пісаў Канстанцін Паўстоўскі, – гэта народнае паэтычнае афармленне краіны. Яны гавораць пра характар народа, яго схільнасці і асаблівасці побыту”.*

Ст.166 падручніка – прыклады 3-5 (ніжні прыклад пакуль прыкрываем). Дапрацоўваем схемы 1-4 на дошцы, дадаючы яшчэ адзін сказ простай мовы.

**Фізкультхвілінка.**

Практыкаванні для вачэй і развіцця разумовай дзейнасці.

**Выпадак 2. Простая мова ў сярэдзіне слоў аўтара.**

Работа з падручнікам. Аналізуем апошнія 4 прыкл.табліцы (с.167).

Работа з тэкстам "Слова пра хлеб" практ.238. Сказы з простай мовай выпісваем на дошку, каменціруем пунктуацыю.

Разгляд сказаў з пр.236 (4) і пр.237 (7). Праблемная сітуацыя. Аналізуем матэрыял падручніка на с.166 – ніжні пункт табліцы (два дзеясловы маўлення).

Работа з раздатачным матэрыялам (урыўкамі з аповесці Івана Шамякіна "Непаўторная вясна", якую вучні праходзяць па беларускай літаратуры):

**Прачытайце прапанаваныя ўрыўкі з мастацкага тэксту. Назавіце твор і яго аўтара. Расстаўце прапушчаныя знакі прыпынку. Праверце сябе па тэксце.**

1. *Ніхто мяне адгэтуль не выганіць. Не пайду вырашыла Саша з упартай рашучасцю Я адна маю права быць пры ім*
2. *Мабыць сваяк нейкі яе…Таму яна і хоча хутчэй выжыць мяне… Я пайду, пайду… Але вы яшчэ ўспомніце мяне невядома каму пагражаў ён і зноў расчулены апраўдваў Сашу Глупства гэта ўсё. Не можа Саша так крывіць душой. Не такая яна…Але чаму яна не сказала, куды пойдзе? Чаму?*

5. **Дамашняе заданне.** Параграф 32, пр.239 (творчае) або 240.

6. **Рэфлексія.**

– Пастарайцеся ўзнавіць 9 схем па тэме ўрока. Выкананне задання дазволіць выставіць матывуючыя адзнакі за ўрок (1 правільна складзеная схема дае 1 бал).

Па жаданні можна выканаць камп'ютарны тэст на адзнаку.